УДК 342.5(438) DOI 10.52928/2070-1632-2024-69-4-75-78

# ІДЭАЛОГІЯ САРМАТЫЗМУ І ЯЕ АДЛЮСТРАВАННЕ Ў ДЗЯРЖАЎНЫМ ЛАДЗЕ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

***А.В. ВАЛЕЎКА***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай)***
***ORCID: https://orcid.org/0000-0003-4258-8095***

*У артыкуле разгледжаны асаблівасці дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай; даследавана сутнасць ідэалогіі сарматызму і прычыны яе распаўсюджання сярод шляхецкага саслоў'я; высветлена ступень уплыву асноўных палажэнняў ідэалогіі сарматызму на дзяржаўны лад Рэчы Паспалітай; зроблены высновы аб значэнні ідэалогіі сарматызму для «шляхецкай дэмакратыі Рэчы Паспалітай».*

***Ключавыя словы:*** *Рэч Паспалітая, Вялікае Княства Літоўскае, ідэалогія сарматызму, шляхецкія вольнасці.*

**Уводзіны** На працягу XVI – XVIII стст. адбываецца ўзмацненне працэсаў саслоўнай дыферэнцыяцыі грамадства Рэчы Паспалітай, закранаючы, у тым ліку, і ВКЛ. У выніку, асаблівае ўзвышэнне ў грамадскім і палітычным жыцці атрымлівае шляхта. Менавіта дасягненне ёю ўсёй паўнаты дзяржаўнай улады з'явілася галоўным фактарам асаблівасцей дзяржаўна-палітычнага ладу Рэчы Паспалітай. Існаванне паняцця выключнасці адносна правоў і свабод шляхецкага саслоў'я прывялі да з'яўлення ў навуковым асяроддзі падыходу, згодна з якім прывілеяванае саслоў'е Рэчы Паспалітай мае назву «шляхецкая нацыя» [1, с. 77].

З другой паловы XVI ст. у Рэчы Паспалітай паміж шляхтай і кожным новым каралём перад яго элекцыяй заключалася спецыяльная дамова – так званая *pacta conventa*, якая вызначала канкрэтныя абавязкі новаабранага манарха і была своеасаблівым індывідуальным кантрактам. Разам з першым дакументам такога роду былі складзены і так званыя «Генрыхавы артыкулы» (назва ад імя першага элекцыйнага караля Генрыха Валуа), у якіх выкладаліся асноўныя прынцыпы шляхецкай дзяржаўнасці. Яны абавязалі караля і вялікага князя прызнаваць вольную элекцыю манарха, забяспечваць рэлігійны мір, не вырашаць пытанняў вайны і міру без згоды сената і сойма, не праводзіць выбараў спадкаемцы пры сваім жыцці, склікаць ардынарны (звычайны) сойм кожныя два гады, а таксама прадугледжвалася магчымасць правядзення надзвычайных з'ездаў шляхты. Калі шляхта лічыла, што яе правы парушаюцца, то магла адмовіцца ад падпарадкавання каралю.

**Асноўная частка** Адным з найважнейшых складнікаў шляхецкай рэспубліканскай традыцыі была распаўсюджаная сярод шляхты ідэалогія сарматызму. Менавіта гэты комплекс ідэй выкарыстоўваўся з мэтай акрэсліць асаблівае месца шляхты ў грамадскай і дзяржаўнай сістэмах, а таксама апраўдваў тыя сродкі, якімі пануючае саслоў'е бараніла свае ўласныя інтарэсы. Ідэалогія сарматызму ў Рэчы Паспалітай грунтавалася на некалькіх крыніцах. Па-першае, назва «Сарматыя» адносна Усходнееўрапейкіх зямель ужывалася з часоў Старажытнай Грэцыі і выкарыстоўвалася таксама ў Сярэднявеччы. У заходнееўрапейскім уяўленні доўгі час з сарматамі атаясамліваліся некаторыя славянскія народы. У сваім класічным сэнсе паняцце «сарматызм» сфарміравалася ў апошняй чвэрці XVI ст. [10, с. 552] Яно набыло саслоўную афарбоўку і стала ўжывацца для абазначэння стылю жыцця і спосабу мыслення шляхты Рэчы Паспалітай, укаранілася ў свядомасці шляхецкага грамадства як увасабленне пачуцця яго саслоўнай і грамадскай выключнасці [6, с. 6]. Гэта паняцце, звязанае з уяўленнем аб шляхецкай дэмакратыі як найболыш дасканалым палітычным ладзе, замацавалася ва ўрачыстай і паўсядзённай лексіцы. У палітычных творах тэрмін «сармат» выкарыстоўваўся нароўні з назвамі «паляк» альбо «літвін» [4, с. 8].

Згодна з пануючымі поглядамі, нашчадкамі сармацкіх народаў лічылася шляхта, як польская, так і «літоўская і руска» – гэта значыць, адзіны палітычны народ: шляхта Рэчы Паспалітай. Такім чынам з гэтага народу выключаліся мяшчане і, зразумела, сяляне. Характэрнае для сармацкай ментальнасці разуменне выключнасці шляхты выдатна адлюстроўвае выказванне аднаго з тагачасных аўтараў: «чалавек шляхецкага паходжання з прыроды і крыві сваёй узвышаецца над простымі людзьмі, таму што ён да дабрадзейнасці і розуму найбольш здольны» [3, с. 171]. Такая гіпербалізаваная павага да свайго стану (саслоўя) набывала часам амаль карыкатурныя формы.

Разам з тым трэба адзначыць, што ідэя сарматызму была прывабнай, у асноўным, для сярэдняй і часткі дробнай шляхты. Магнатэрыя, як найбольш адукаваная частка тагачаснага грамадства, не захаплялася сармацкім міфам, яе звычкі насілі больш касмапалітычны характар, хоць прадстаўнікі гэтага стану і ўдастойваліся громкіх прозвішчаў, напрыклад Юры Радзівіл зваўся «сармацкім Геркулесам» [4, с. 9]. Набілітэт ВКЛ меў таксама сваю легенду аб паходжанні ад старажытных знатных рымлян, якія на чале з Палемонам прыбылі на тэрыторыю Літвы [3, с. 173]. У той час, беларуска-украінская арыстакратыя атаясамлівала сябе з нашчадкамі Рурыкавічаў.

Ва ўяўленні грамадскай свядомасці іншыя славяне таксама належалі да сарматаў, але галоўнай сармацкай дзяржавай лічылася Рэч Паспалітая. Маскоўскую дзяржаву залічалі да Сарматыі ў залежнасці ад знешнепалітычнай кан'юнктуры. У час першага бескаралеўя прыхільнікі маскоўскай кандыдатуры на польскі трон падкрэслівалі магчымасць аб'яднання ў адзіную дзяржаву абедзвюх Сарматый (Еўрапейскай і Азіяцкай). Напрыклад, у пачатку XVII ст. міф пра сарматаў выкарыстоўваўся ў якасці ідэалагічнага падмурку для экспансіі на Усходнія землі, якія быццам бы належалі ў старажытнасці сарматам – продкам палякаў.

Увогуле знешнепалітычнае становішча Рэчы Паспалітай у пачатку XVII ст. (ваенныя канфлікты з некаталіцкімі краінамі: мусульманскай Турцыяй, пратэстанцкай Швецыяй, праваслаўнай Маскоўскай дзяржавай) спрыяла наданню сармацкай ідэалогіі элементаў місіянерства, уяўленню аб Рэчы Паспалітай як апоры каталіцтва. У выніку гэтага шматлікая шляхта Рэчы Паспалітай лічыла сябе Богам абраным народам, які здолеў, між іншым, стварыць дасканалую дзяржаўную сістэму, якая магла гарантаваць шляхецкія правы і вольнасці.

Інтэграцыйныя працэсы ў асяроддзі шляхты (асабліва сярэдняй), развіццю якіх спрыялі агульныя прывілеі шляхецкаму стану, удзел у адзіных формах палітычнага жыцця (ад соймікаў да вайсковых канфедэрацый), уніфікацыя школьнай сярэдняй адукацыі, здзейсненай з дапамогай каталіцкага Ордэну іезуітаў, прыводзілі да фарміравання адзінай ідэалогіі і, нават, стылю жыцця [6, с. 78]. Большая частка шляхты прытрымлівалася адных і тых жа рэлігійных перакананняў, вызнавала тыя ж палітычныя і грамадскія погляды, цытавала тых жа аўтараў, карысталася тымі ж цытатамі [3, с. 153]. З цягам часу склаўся ўзорны вобраз сапраўднага шляхціча-сармата: патрыёта сваёй Айчыны і свайго стану, добрага рыцара, які ўвасабляў традыцыі старажытных сарматаў, красамоўнага аратара на соймах і сойміках, які выступаў у абарону шляхецкіх вольнасцей, асобы, здольнай узняцца над уласнымі інтарэсамі дзеля агульнай карысці [6, с. 77]. У духу свайго часу, нават у паўсядзённым жыцці, шляхта, згодна з прынцыпамі ідэалогіі сарматызму, выказвалася напышліва і патэтычна, вельмі часта ўжываючы польскія словы разам з лацінскімі. Пазней вельмі іранічна пісаў пра гэта М. Сарбеўскі: «У іншых красамоўства знаходзіць сабе месца ў кніжках, у нас пануе на сходах, на сеймах... Празмернае, аднак, замілаванне і схільнасць да красамоўства прыводзіць іх... часта да амаль дзіцячай гаварлівасці. Пры калысцы і пры катафалку, пры стале і пры шлюбе – заўсёды выглашаюць прамовы... Дваране сваіх паноў, якія вяртаюцца з горада, вітаюць прамовамі, быццам тыя з Індыі прыбылі» [3, с. 156]. Палітычны ідэал сарматызму – дзяржаўны традыцыяналізм, кансерватызм («нічога новага»), непрыманне абсалютызму. Добры сармацкі манарх – гэта ўраджэнец Рэчы Паспалітай, якога ў першую чаргу цікавяць справы вайсковыя, а ўжо потым мастацтва і рэлігія, які апранаецца ў польскі строй, а не ў іншаземнае адзенне, і павінен дбаць аб захаванні шляхецкіх прывілеяў і вольнасцей. Ідэальныя рысы караля-сармата ўвасобіў Ян ІІІ Сабескі (1674–1696). Усхваленне даўніх правоў і звычаяў, перакананне ў сваёй культурнай, палітычнай і нацыянальнай выключнасці спрыялі фарміраванню ўяўлення аб нацыянальных рысах «сармацкага» характару – гасціннасці, шчырасці, годнасці, а галоўнае – любові да свабоды.

Між тым у дзяржаве меліся і крытыкі ідэй сарматызму. Напрыклад, пісьменнік Сымон Старавольскі, аўтар кнігі «Сармацкія помнікі», выдадзенай у Кракаве ў 1655 г., пісаў аб шляхецкай фанабэрыі наступнае: «... згадваюць старажытныя нашыя роды, быццам перад рымлянамі і нават самімі персамі над светам панавалі... тым больш зараз, калі нас бунт казацкі знішчыў і Масквіцін трымае за фалды» [3, с. 156].

Яшчэ адной адметнай рысай шляхецкага ладу Рэчы Паспалітай была роўнасць усіх прадстаўнікоў шляхты. Як адзначаў С. Кутшэба, гэта было абумоўлена адначасовым існаваннем напрацягу некаторага часу паняцця роду і новаўтворанага паняцця «шляхта» [5, с. 59]. Пасля прыняцця гербаў (што азначала прыняцце ў кола шляхты) радавыя сувязі толькі ўзмацніліся. Такім чынам, у склад шляхты ўваходзілі цэлыя роды, а не асабістыя людзі і іх блізкія родныя, шляхецкія правы і прывілеі атрымоўвалі эканамічна і грамадска слабыя людзі, адзінай апорай якіх была прыналежнасць да таго ці іншага роду. Шляхцічам нават не абавязкова было мець зямлю, каб атрымаць тытул.

У палітычна-прававым кампаненце ідэалогія сарматызму знаходзіла сваё ўвасабленне ў канцэпцыі «залатой шляхецкай вольнасці». Галоўнымі з гэтых вольнасцей лічыліся роўнасць усіх шляхцічаў перад законам, права на свабодную элекцыю караля, права кожнага шляхціча на свабоду голасу, права на пратэст, а таксама недатыкальнасць асобы шляхціча і яго маёнтку (з 1588 г. шляхецкія сядзібы былі абаронены ад усялякіх рэвізій) [2, с. 353]. Фармальна правы шляхты мелі абсалютны характар. Вольнасці маглі абмежаваць толькі пастановы сойма і соймікаў, аднак, улічваючы, што яны прымаліся той самай шляхтай, можна зрабіць выснову аб вельмі нізкай магчымасці прыняцця такіх актаў. У той час, як без згоды шляхецкіх паслоў кароль і вялікі князь не меў права ні накладаць падаткі, ні збіраць паспалітае рушанне ці пачынаць вайну, ні выдаваць якія-небудзь іншыя прававыя акты, што тычыліся б шляхты.

Яшчэ адной важнай характарыстыкай шляхетскай дэмакратыі, якая ўвасабляла палітыка-прававыя прынцыпы ідэалогіі сарматызму, з'яўлялася права на стварэнне канфедэрацый [8, с. 36]. На працягу XVII ст. канфедэрацыі збіраліся ў Рэчы Паспалітай дзясяткі разоў –альбо ў якасці бунту супраць манарха і дасягнення сваіх патрабаванняў, ці, наадварот, для яго падтрымкі. Канфедэрацыя магла існаваць у форме рокашу і з'яўлялася афіцыйнай формай узброенай барацьбы супраць дзяржаўнай улады. Дамагаючыся сваіх палітычных мэтаў, канфедэрацыі ўцягвалі ў дзяржаўнае жыццё шырокія колы шляхты і войска. А магнаты, апрача мноства служылай шляхты, мелі прыватныя вайсковыя адзінкі, часам, мацнейшыя за дзяржаўную армію. Напрыклад, слуцкі князь Геранім Фларыян Радзівіл (1715–1760) трымаў каля шасці тысяч рэгулярнага войска і такую ж колькасць казакоў ды стралкоў. У мэтах падрыхтоўкі афіцэрскіх кадраў для сваёй прыватнай арміі Радзівілы нават адкрылі ў Слуцку і Нясвіжы спецыяльныя кадэцкія карпусы, а гетманам Міхаілам Казімірам Радзівілам у Нясвіжы была заснавана ўласная вайсковая акадэмія. Наяўнасць такой сілы ў алігархаў фактычна вяла да дэцэнтралізацыі дзяржаўнай улады і небяспечнага ўкаранення палітычнай анархіі ў Рэчы Паспалітай [9, с. 304–305].

Тым не менш, тагачасная сістэма ўяўлялася шляхтай як самая дасканалая і кожная спроба нешта змяніць успрымалася як імкненне да дыктатуры. Самым вядомым ідэолагам канцэпцыі «залатой вольнасці» і ідэалогіі сарматызму ўвогуле стаў львоўскі кашталян Анджэй Максімільян Фрэдра (1620–1679), які ў 1660-х гг. выдаў

некалькі трактатаў, абараняючых існуючы лад [7, с. 133]. Напрыклад, абгрунтоўваючы перавагі традыцыйнага для Рэчы Паспалітай прынцыпу адзінагалоснага прыняцця пастановаў (*liberum veto*), ён пісаў, што ў адваротным выпадку, калі б рашэнні прымаліся большасцю галасоў, мноства горшых пераважыла б над меншасцю лепшых, і для краіны гэта прынесла б значна большыя шкоды [7, с. 134]. Між тым, нягледзячы на ўсе спробы абяліць існуючую сістэму, на практыцы ідэі сарматызму і шляхецкай вольнасці мелі самыя негатыўныя наступствы, непасрэдна ўплываючы на паслабленне дзяржавы, якое заканамерна скончылася падзеламі яе тэрыторыі.

На тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага склалася асаблівая сітуацыя. Справа ў тым, што магнаты там заўсёды мелі перавагу над астатняй шляхтай. У аслабленай войнамі дзяржаве першыя роды Літвы і Беларусі вялі зацятую барацьбу за гегемонію ў краіне. Кожны з іх быў супраць цэнтралізацыі і ўмацавання ўлады манарха, бо ўніфікацыя палітычнай сістэмы Княства паводле кароннага ўзору азначала б дэмакратызацыю парадкаў і страту магнатамі іх ранейшай улады. Багатыя магнацкія роды часта складалі апазіцыю каралеўскай уладзе. Звычайна кароль падтрымліваў адзін з родаў, які супрацьстаяў апазіцыйнаму. Напрыклад, Ян ІІ Казімір у супрацьстаянні ўплывам Радзівілаў абапіраўся спачатку на падтрымку Гасеўскіх, а потым Пацаў [9, с. 307]. Калі ж у дзяржаве найбольшы ўплыў атрымалі Пацы, наступны кароль Ян ІІІ Сабескі выставіў супраць іх Сапегаў. Нягледзячы на гэта, кожны вялікі магнацкі род, падтрыманы манархам, пасля атрымання ўлады сам станавіўся ў апазіцыю.

**Заключэнне** Такім чынам, распаўсюджанне ідэалогіі сарматызму вяло, з аднаго боку, да кансалідацыі шляхецкага саслоў’я, у значнай ступені павышаючы ўзровень яго палітычнай культур, з другога – злоўжыванне шляхтай сваімі правамі вяло да заняпаду дзяржавы і поўнага яе знікнення. Атрымаўшы са згоды манарха ўсемагчымыя прывілеі і пануючы стан па-над усім грамадствам, шляхта як саслоўе пачала перажываць апатыю і паступова выраджалася. Да агульнага ўнутранага бязладдзя дадаваўся падтрыманы ідэалогіяй сарматызму партыкулярызм, які паралізоўваў дзейнасць палітычных установаў Рэчы Паспалітай. У сукупнасці з іншымі фактарамі шырокае распаўсюджанне палітычна-прававых прынцыпаў ідэалогіі сарматызму прывяло Рэч Паспалітую ў стан непераадольнага крызісу, які, урэшце, скончыўся стратай суверэнітэту.

ЛІТАРАТУРА


1. Вішнеўскі А.Ф., Вішнеўская І.У. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: вучэб. дапам. – Мінск: Тэтра-Сістэмс, 2005. – 192 с.
2. Вольнасці шляхецкія // Вялікае Княства Літоўскае. Энцыклапедыя у 3 т. – Мінск: БелЭН імя П. Броўкі, 2005. – Т. 2: Кадэцкі корпус – Яцкевіч. – С. 353.
3. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.). – Мінск: Экаперспектыва, 2007. – Т. 3: Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII – XVIII ст.) / Ю. Бохан і інш. – 2007. – 344 с.
4. Климуть Л.Я. Сармацкая ідэалогія на беларускіх землях Рэчы Паспалітай // Веснік БДУ. Сер. 3. – 2012. − № 2. – С. 7−11.
5. Кутшеба С. Очерк истории общественно-государственного строя Польши / Пер. с польск. и вступ. ст. Н.В. Ястребов. – СПб.: Изд-во А.С. Суворина, 1907. – 231 с.
6. Лесинен М.В. Мифы и образы сарматизма. Истоки национальной идеологии Речи Посполитой / РАН, Ин-т славяноведения. – М., 2002. – 178 с.
7. Мержва Я.А. Анджей Максимилиан Фредро о Liberum Veto // Вестник СПбГУ. Сер. 2. – 2015. – Вып. 1. – С. 132−138.
8. Пазднякоў В. Канфедэрацыя // Вялікае Княства Літоўскае. Энцыклапедыя у 3 т. – Мінск: БелЭН імя П. Броўкі, 2005. – Т. 2: Кадэцкі корпус – Яцкевіч. – С. 36–37.
9. Сагановіч Г. Нарыс гісторыі Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII ст. – Мінск: Энцыклапедыкс, 2001. – 412 с.
10. Сарматызм // Вялікае Княства Літоўскае. Энцыклапедыя у 3 т. – Мінск: БелЭН імя П. Броўкі, 2005. – Т. 2: Кадэцкі корпус – Яцкевіч. – С. 552–553.


*Паступіў 04.11.2024*

## ИДЕОЛОГИЯ САРМАТИЗМА И ЕЁ ОТРАЖЕНИЕ В ГОСУДАРСТВЕННОМ УСТРОЙСТВЕ РЕЧИ ПОСПОЛИТОЙ

***А.В. ВАЛЕВКО***
***(Полоцкий государственный университет имени Евфросинии Полоцкой)***

*В статье рассмотрены особенности государственного устройства Речи Посполитой; исследована сущность идеологии сарматиза и причины её распространения среди шляхетского сословия; выявлена степень влияния основных положений идеологии сарматизма на государственное устройство Речи Посполитой; сделан вывод о значении идеологии сарматизма для «шляхетской демократии Речи Посполитой».*

***Ключевые слова:*** *Речь Посполитая, Великое Княжество Литовское, идеология сарматизма, шляхетские вольности.*

# THE IDEOLOGY OF SARMATISM AND ITS REFLECTION IN THE STATE ORDER OF THINGS OF THE COMMONWEALTH

***A. VALEVKO***
***(Euphrosyne Polotskaya State University of Polotsk)***

*The article examines the peculiarities of the state system of the Commonwealth of Nations; the essence of the ideology of Sarmatism and the reasons for its spread among the nobility were investigated; the degree of influence of the main provisions of the ideology of Sarmatism on the state system of the Polish-Lithuanian Commonwealth is clarified; conclusions were made about the importance of the ideology of Sarmatism for the "noble democracy of the Polish-Lithuanian Commonwealth".*

***Keywords:*** *Commonwealth, Grand Duchy of Lithuania, ideology of Sarmatism, noble liberties.*